Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования «Барановичский государственный университет»
Факультет педагогики и психологии
Факультет славянских и германских языков

# СПЕЦИАЛИСТ XXI ВЕКА: ПСИХОЛОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ КУЛЬТУРА И ПРОФЕССИОНАЛЬНАЯ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

Материалы IV Международной
научно-практической конференции

(Барановичи, 22 октября 2015 года)

Репозиторий БарГУ

Барановичи
БарГУ
2015

УДК 37(063)

Включены материалы докладов IV Международной научно-практической конференции «Специалист XXI века: психолого-педагогическая культура и профессиональная компетентность» по актуальным проблемам следующих научных дисциплин и направлений: психология, педагогика, филология, лингвистика и методика преподавания иностранных языков, эколого-краеведческое образование, человек в обществе, организация здоровьесбережения, обучение, воспитание и развитие дошкольников.

Адресовано преподавателям и студентам учреждений высшего образования, магистрантам, аспирантам.

Редакционная коллегия:

А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Прадун, А. А. Селезнёв (отв. ред.), Е. И. Белая, А. В. Демидович, Н. Г. Дубешко, Н. А. Егорова, А. В. Земоглядчук, Е. А. Клещёва, В. И. Козел, З. И. Корзун, Д. С. Лундышев, Н. М. Плескацевич, А. А. Савко, К. С. Тристень

Рецензенты:

доктор психологических наук, профессор, профессор кафедры психологии управления Академии управления при Президенте Республики Беларусь Ю. А. Коломейцев,
кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры польской филологии учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» О. Е. Панькова

Репозиторий БарГУ

ISBN 978-985-498-687-6

© БарГУ, 2015

УДК 82-31

**Т. М. Пучынская**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт», Баранавічы*

# АЎТАБІЯГРАФІЗМ У РАМАНЕ Г. МАРЧУКА «КВЕТКІ ПРАВІНЦЫІ»

**Уводзіны.** Імя Георгія Марчука, пісьменніка, сцэнарыста, рэжысёра, драматурга, шырока вядома не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Яго творы перакладзены на шэраг моў свету. Георгій Марчук плённа працуе ў розных жанрах, звяртаючыся да найбольш блізкай яму тэмы малой радзімы, мястэчка, правінцыі. Яго раман «Кветкі правінцыі», адзін з найбольш значных і арыгінальных твораў, цікавы сваёй мастацкай паліфанічнасцю. Жанравая прырода рамана пазначана судакрананнем з рознымі жанрамі, у тым ліку і з аўтабіяграфічнай прозай.

**Асноўная частка.** У эпічным творы прысутнасць аўтара амаль заўсёды адчувальная. Асаблівая паўната прысутнасці аўтара ўзнікае тады, калі выразна прасочваецца аўтабіяграфічны пачатак. У творах эпічных жанраў часцей за ўсё аўтарскае «я» суадносіцца з асобай галоўнага героя. Аўтар можа выкладаць уласную біяграфію, працэс станаўлення сваёй асобы сродкамі паказу вымышленага героя, таму адназначна вызначыць мяжу паміж дакументальным і мастацкім пачаткам у творы даволі складана. Энцыклапедычныя даведнікі вызначаюць змест паняцця «аўтабіяграфічны жанр» наступным чынам: «літаратурныя творы, у якіх аўтары прама ці ўскосна апісваюць уласнае жыццё» [1, с. 223]. Да аўтабіяграфічнага жанру адносяць аўтабіяграфію, мемуары, дзённік, споведзь, падарожныя нататкі. Пад уплывам эстэтычнай апрацоўкі аўтабіяграфія як паслядоўнасць рэальных падзей у большай ці меншай ступені трансфармуецца, ператвараючыся ў мастацкі факт у творах іншых жанраў — апавяданнях, аповесцях, раманах. Аўтабіяграфічны пачатак часцей за ўсё ўказвае не на самастойны жанр, а на літаратурны прыём. Інакш кажучы, аўтабіяграфізм можа прысутнічаць у любым літаратурным жанры, у якім аўтар больш непасрэдна гаворыць пра сябе, пра станаўленне сваёй асобы, адкрыта выказвае погляды на свет і на сваё месца ў ім.

Фактычна ў кожнага пісьменніка ёсць творы ў пэўнай ступені аўтабіяграфічныя. У Г. Марчука гэта раман «Кветкі правінцыі». На пытанне журналіста газеты «Літаратура і мастацтва» «Наколькі аўтабіяграфічны ваш раман “Кветкі правінцыі”?» Г. Марчук адказаў так: «Аснова гэтага твора — маё юнацкае жыццё. Для пісьменніка вельмі важна мець фантазію, але ў прозе яна дапамагае толькі да той пары, пакуль існуе логіка паводзін… “Кветкі правінцыі” — гэта споведзь і прызнанне ў любові землякам, малой радзіме, мястэчку, дзе я нарадзіўся… Гэты твор дарагі мне найперш успамінамі пра маладосць… “Кветкі правінцыі” — гэта акварэль, прыгожыя фарбы, імкненне перадаць аўру…» [2].

Аўтабіяграфізм у рамане выяўляецца ў падзейным і эмацыянальным плане праз лёс галоўнага героя Адася Долі. Яго вобраз адлюстроўвае рэтраспектыўнае асэнсаванне аўтарскай біяграфіі, звязанай з жыццём у Давыд-Гарадку, з маладосцю, юнацтвам. Г. Марчук акцэнтуе ўвагу на праблеме ранняга сіроцтва свайго героя. Адася, як і самога аўтара, жыццё выпрабоўвала на трываласць з дзяцінства: мамы рана не стала, а выхаванне ўзяла на сябе бабуля. Успамін пра маці асвечаны ў душы героя цёплым і разам з тым надзвычай шчымлівым пачуццём. Глыбокі боль ад страты маці ў душы Адася з гадамі не праходзіць, не прытупляецца. Нават маючы ўласную сям'ю, жывучы ў горадзе, займаючыся пісьменніцкай працай, Адась жыве думкамі пра маці, бацькоўскі дом, родныя мясціны. Відаць, кожны чалавек, асабліва з гадамі, пачынае больш сумаваць па бацьках. Аднак у Адася гэтае пачуццё абвостранае: ён усё жыццё адчувае сябе пакінутым, адзінокім менавіта з-за ранняй смерці маці. Цеплыня і клопат бабулі, безумоўна, саграваюць яго асірацелае жыццё ў дзяцінстве, юнацтве, але без адказу

© Пучынская Т. М., 2015

Рэпазіторый БарДУ

застаюцца пытанні: чаму трагічны лёс сіраты выпаў менавіта яму, Адасю? Чаму заўчасна пайшла з жыцця маці? Чаму бацька жыў сваім асобным жыццём? Прозвішча галоўнага героя — Доля — наводзіць чытача на роздум аб трагічнай наканаванасці лёсу.

Аўтабіяграфізм у літаратурным творы, як правіла, звязаны з акцэнтам на духоўным сталенні героя. У рамане «Кветкі правінцыі» герой праходзіць складаны шлях маральнага развіцця. Перад чытачом паступова разгортваецца карціна духоўнай эвалюцыі Адася, пачынаючы ад апісання жыцця хлопчыка, разгубленага і пакінутага, да выяўлення вобраза цалкам самадастатковай асобы ў канцы рамана.

Першае і самае складанае выпрабаванне ў жыцці — смерць і пахаванне маці: *«Кожны чужы, хто ішоў паглядзець нябожчыцу, не мінаў мяне словамі:*

*— Бедны сіротка. Бедны сірацінка»* [3, с. 14]. З моманту смерці і пахавання маці Адась успрымае свет па-іншаму,ён павінен клапаціцца пра сябе сам, а яго жыццё назаўсёды пазначана трагічнымі фарбамі сіроцтва. Спалучэнне слоў «кожны чужы» акцэнтуе ўвагу на жаданні хлопчыка перажыць сваё гора самастойна. Спачуванне «чужых» людзей не дадае душэўнай раўнавагі: *«Аднагодкі, аднакласнікі, якія трапляліся насустрач, як мне падалося, менш глядзелі на нябожчыцу, а ўсе спачувальна, з нейкім жалем не зводзілі вачэй з мяне. Мне рабілася няёмка ад злосці, я апусціў галаву, каб не страчацца з імі паглядамі»* [4]. У душы Адася пераплятаюцца глыбокі боль, смутак, адчай, страх, разгубленасць. Жыццё назаўсёды падзялілася на «да» і «пасля»: *«Усё... Зямлёй, падобнай колерам на счарнелую салому, прысыпалі труну з маёй маці навекі»* [5].

Матыў сіроцтва ў рамане Г. Марчука займае асаблівае месца, і гэта зразумела: аўтар перажыў трагічнае пачуццё асабіста, аднак змест твора вызначаецца не толькі адбіткам вострых індывідуальных ураджанняў. Драматызм лёсу героя, пазначанага сіроцтвам і жыццёвымі пакутамі, набывае тыповы характар: *«Я доўгі час лічыў, што я адзін сіроцтвую, гатовы быў стартаваць у сваім гэтым сіроцтве і хваробе. Кожны чалавек мусіць цярпліва змагацца за жыццё, усведамляць адказнасць за яго, за дзяцей, за род свой. Раптам яны паўсталі перад вачыма маімі ўсе: больш за сотню, іх адразу і не палічыш, усе рабацяшчыя і сціплыя, слабыя і дужыя, вясёлыя і бедныя, упартыя і бязвольныя, рахманыя і вынаходлівыя, зацятыя і незласлівыя, хворыя і пакінутыя, добрыя і скупыя, усе — святыя і грэшныя людзі мае, і так мне іх разам зрабілася шкада ўсіх, так невыносна, да болю ў сэрцы, захацелася, каб яны жылі, што я папрасіў у Бога не забіраць іх, прадоўжыць іх жыццё»* [6]. У рамане Г. Марчук выступае як прапаведнік духоўнасці, спавядае ідэю чалавечнасці, дабрыні, любові, маральнай адказнасці. Перад Богам ён просіць даравання «святым і грэшным людзям».

Аўтабіяграфічны пачатак у рамане ўзмацняецца дзякуючы шчымлівай спавядальнасці аўтарскага аповеду, герой ад першай асобы непасрэдна выяўляе самыя патаемныя і складаныя рухі ўласнай душы. У сувязі са смерцю маці Адась перажывае пачуццё віны, твор напаўняецца матывам пакаяння: *«Раптам, на нейкім віражы сваіх думак і ўспамінаў, я зразумеў, што ў смерці маці, відаць, найбольш вінаваты я сам! Я пачаў шкадаваць яе, мёртвую, як жывую, бо жывую не шкадаваў, бо жывой яна якраз была для мяне як усё роўна мёртвая»* [7]. У канцы рамана Г. Марчук непасрэдна ўказвае на тое, што словы яго героя маюць спавядальны характар, што звернуты яны да асобнага чытача і народа ў цэлым: *«Мне застаецца сказаць і вам добрае слова ўдзячнасці, паважаны чытач, што знайшлі час выслухаць маю споведзь. Я паспавядаўся, і на душы ўсё ж зрабілася лягчэй. Бо ты ж народ, а мой народ і ёсць Бог для мяне таксама»* [8].

Акрамя ранняга сіроцтва, у юнацтве Адасю давялося прайсці яшчэ адно выпрабаванне. Г. Марчук увасабляе ідэю сталення, развіцця асобы праз спакушэнне героя хваробай. Адась Доля праходзіць праз гэта выпрабаванне годна, ён загартоўвае характар, набывае выключную волю да жыцця. *«У дыспансеры людзі паміралі непрыкметна як бы, але часта. Ходзіць чалавек, грэецца на сонейку, гуляе ў шахматы, слухае анекдоты, рагоча, потым яго не відаць на двары тыдзень, два, а пасля кажуць: павезлі яго ў палату № 2 (смяротнікаў)... Патроху і я звыкся з гэтым, нават падыходзіў адзін да палаты № 2, мог зазірнуць у яе. Дыспансер з аблупленай тынкоўкай на сценах зрабіўся маім домам, а ўсё, што адбывалася ў доме, стала маім»* [9].

Дыспансер і «лёгачны» санаторый сталі асобнай старонкай у жыцці Адася, якая яму запомнілася не толькі гісторыяй змагання за жыццё, але і адкрыццём першага кахання, пошукам адказаў на філасофска-інтэлектуальныя пытанні быцця: *«"Вінаваціць трэба найперш сябе, тады і высветліцца, хто з астатніх вінаваты", — намагаўся я на манер Булькі філасофстваваць»* [10]. У санаторыі Адась трапляе ў атмасферу «высокага жыццёвага тонусу хворых падлеткаў» і праз першае каханне, юнацкае сяброўства, рамантыку маладосці паступова адраджаецца для жыцця: *«Вялікі, непазнавальны і таямнічы горад клікаў мяне да сябе з акна дыспансера. Віцеў брат прынёс нам цывільную адзежу (штаны, сарочкі). Мы іх схавалі пад цэглу на будоўлі клуба і, шчаслівыя, чакалі моманту, калі з'явіцца магчымасць сігануць у самаволку, у гарадскі парк, які, у адрозненне ад нашага давыд-гарадоцкага сквера, быў проста дзівосным раем»* [11]. У канцы рамана Адась паўстае як самадастатковая асоба, якая мае ўласную пазіцыю, сваю жыццёвую праўду: *«Трэба знайсці сілы і смеласць насіць у сабе мінулае, і яно дапаможа не баяцца смерці. Ave vita!»* [12].

Аўтабіяграфічны момант прасочваецца і на этапе «дарослага» жыцця Адася Долі. Стварэнне ўласнай сям'і, нараджэнне дачкі, пісьменніцкая праца, жыццё ў вялікім горадзе і пастаянныя думкі пра

Рэпазіторый БарДУ

Давыд-Гарадок, захапленне някідкай прыгажосцю кветак правінцыі, адчуванне пяшчотнай цеплыні роднай зямлі. Ствараючы аўтабіяграфічны вобраз, пісьменнік не толькі паказвае працэс станаўлення сваёй асобы, але і асэнсоўвае яе сувязь з сучаснасцю і сучаснікамі.

**Заключэнне.** У рамане «Кветкі правінцыі» прысутнічае аўтабіяграфічны матэрыял, але нельга забываць і пра існаванне «дыстанцыі» паміж аўтарам і аўтабіяграфічным персанажам. Мастацкасць твора характарызуецца наяўнасцю пісьменніцкай фантазіі, вымыслу, таму аўтабіяграфізм неабходна разглядаць перш за ўсё як крыніцу набліжэння аўтара да рэальнага жыцця, як жывы, даверлівы дыялог з чытачом. На аўтабіяграфічным матэрыяле Г. Марчук стварае абагулены і тыповы вобраз сучасніка, улюбёнага ў родную зямлю, малую радзіму. Яго герой цесна злучаны з вытокамі свайго роду, самога жыцця. Сёння, калі духоўныя арыенціры часам губляюць выразнасць, асабліва значнай становіцца актуальнасць маральных асноў жыцця, асабістых, індывідуальных, разам з тым узведзеных у ранг традыцыйных, народных.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелСЭ, 1984—1987. Т. 1 : А капэла. — Габелен. 1984. С. 223.
2. «Бяры тэму, якую да цябе ніхто не браў!» [Электронны рэсурс] // Архіў сайта газеты ЛіМ. URL: www.main.lim.by/?p455 (дата звароту: 07.01.2015).
3. Марчук Г. Кветкі правінцыі: раман, навелы, афарызмы. Мінск : Маст. літ, 2004. 416 с. (Беларуская проза XX стагоддзя).
4. Там жа. С. 14.
5. Там жа. С. 15.
6. Там жа. С. 326.
7. Там жа. С. 16.
8. Там жа. С. 257.
9. Там жа. С. 103.
10. Там жа. С. 120.
11. Там жа. С. 66.
12. Там жа. С. 258.


Матэрыял паступіў у рэдакцыю 11.05.2015 г.

Репозиторий БарГУ